**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**
**Філалагічны факультэт**
**Кафедра рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры**

# Анатацыя да дыпломнай работы «Развіцце маўленчых уменняў вучняў на матэрыяле партрэтных апісанняў»

**Лявончык Марына Анатольеўна,**
**кіраўнік Таяноўская І. У.**

**2014**

# РЭФЕРАТ ДЫПЛОМНАЙ РАБОТЫ

*Агульны аб'ём дыпломнай работы* – 70 старонак; змяшчае 1 малюнак, 2 дадаткі (6 с.); спіс выкарыстанай літаратуры (6 с.) складаецца з 82 найменняў.

**КЛЮЧАВЫЯ СЛОВЫ:** ПАРТРЭТНАЕ АПІСАННЕ, МАЎЛЕНЧЫЯ ЎМЕННІ, СТЫЛЁВАЯ СПЕЦЫФІКА, НЕДАХОПЫ ПАРТРЭТНЫХ ХАРАКТАРЫСТЫК, МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ.

***Аб'ектам*** даследавання з'яўляецца працэс навучання партрэтнай характарыстыцы на ўроках беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. ***Мэта*** дыпломнай працы – прапанаваць методыку навучання партрэтнай характарыстыцы чалавека на ўроках беларускай мовы з удакладненнем спецыфікі зместу і рэалізацыі навучальнай працы, накіраванай на развіццё маўленчых уменняў вучняў. Для ажыццяўлення мэты даследавання неабходна было вырашыць наступныя ***задачы***: ахарактарызаваць сутнасць стылёвай дыферэнцыяцыі партрэтных апісанняў, што падлягае ўліку ў працэсе навучання, на аснове аналізу навуковай літаратуры; вызначыць і сістэматызаваць найбольш тыповыя недахопы, уласцівыя беларускамоўным партрэтным тэкстам школьнікаў; распрацаваць практыкаванні па навучанню партрэтнай характарыстыцы чалавека, дадатковыя да наяўных метадычных крыніц; падабраць адпаведны маўленчы матэрыял і праверыць перспектыўнасць выкарыстання прапанаваных заданняў.

***Метады*** выканання працы: аналіз літаратуры па функцыянальнай стылістыцы і методыцы развіцця маўлення вучняў, педагагічны эксперымент (канстатавальны, навучальны). ***Практычная значнасць*** даследавання зводзіцца, у першую чаргу, да магчымасці ўжывання яго вынікаў для ўдасканалення маўлення школьнікаў і распрацоўкі дадатковых метадычных рэкамендацый па беларускай мове.

У дыпломнай рабоце сістэматызавана прадстаўлена стылёвая спецыфіка партрэтнага апісання чалавека. Аналізуюцца тыповыя недахопы партрэтных характарыстык у маўленчай дзейнасці вучняў на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Выяўляюцца найбольш распаўсюджаныя недахопы беларускамоўных партрэтных апісанняў, падрыхтаваных вучнямі 7-х класаў, на ўзроўні зместу, пабудовы і моўнага афармлення тэксту. Прапаноўваецца методыка развіцця маўленчых уменняў вучняў з прыцягненнем партрэтных апісанняў.

**ABSTRACT**

Leonchik Marina Anatolyevna.

**Development of students' speech skills using the material of portrait description**

The total volume of the diploma work – 70 pages; contains 1 picture, 2 applications (6 p.); list of references (6 p.) consists of 82 items.

***KEYWORDS*:** PORTRAIT DESCRIPTION, SPEECH SKILLS, STYLISTIC SPECIFICITY, DEFECTS IN PORTRAIT CHARACTERIZATION, METHODS OF SPEECH DEVELOPMENT.

*Object* of study is the process of learning of the portrait description at the lessons of the Belarusian language in institutions of secondary education.

The *purpose* of the diploma work is to describe the methods of training portrait characteristic of a person in the classroom with the Belarusian language clarifying the specifics of content and realization of educational activities aimed at the development of pupils' verbal skills.

To achieve the goal of research we need to solve the following *tasks*:

● to characterize the nature of stylistic differentiation of portrait descriptions to be considered in the process of learning, based on the analysis of scientific literature;

● to identify and classify the most typical drawbacks of Belarusian-portrait texts of schoolchildren;

● to develop training exercises for learning of the portrait characteristic of a person, in addition to existing methodic sources;

● to choose the appropriate speech material and to test the use of the proposed tasks.

*Methods used in the work*: an analysis of the literature on functional style and methods of students' speech development, pedagogical experiment (ascertaining and training).

*The practical significance* of the study is, first and foremost, the possibility of using the results to improve students' speech and develop further guidelines in the Belarusian language.

In the diploma work stylistic specificity of the portrait description of a person is systematically presented. Typical defects of portrait descriptions in speech activity of students at Level II of general secondary education are analyzed. The most common drawbacks in Belarusian portrait descriptions prepared by the students of 7th form, at the level of content, structure and verbal form of text are identified. The methods of students' speech development skills are proposed involving portrait descriptions.